# V ЮБІЛЕЙНАЯ МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «ЛЕМКІ, БОЙКІ, ГУЦУЛЫ, РУСІНЫ — ГІСТОРЫЯ, СУЧАСНАСЦЬ, МАТЭРЫЯЛЬНАЯ І ДУХОЎНАЯ КУЛЬТУРА» (Слупск, 24—26 верасня 2015 г.)

На базе Акадэміі Паморскай у Слупску (Польшча) адбылася V Міжнародная навуковая канферэнцыя «Лемкі, бойкі, гуцулы, русіны — гісторыя, сучаснасць, матэрыяльная і духоўная культура», якая была прысвечана 70-й гадавіне высялення ўкраінскага насельніцтва з Польшчы ў СССР у 1944—1946 гг. Галоўным арганізатарам сустрэчы выступіў Інстытут гісторыі і паліталогіі Акадэміі Паморскай у Слупску. Аднак сабраць у адным месцы вялікую колькасць даследчыкаў і грамадскіх дзеячаў з Польшчы, Украіны, Славакіі, Сербіі, Беларусі, ЗША ў Слупску было б немагчыма без дапамогі Універсітэта ў Зялёнай Гуры і Украінскага гістарычнага таварыства ў Польшчы, Універсітэта ў Новым Садзе (Сербія), Нацыянальнай акадэміі навук Украіны, Ужгарадскага нацыянальнага ўніверсітэта, Універсітэта імя М. Белы ў г. Банска-Бістрыца і Музея ўкраінскай культуры (Славакія).

Работа канферэнцыі адбывалася ў дзвюх секцыях — «Гісторыя» і «Матэрыяльная і духоўная культура», кожная з якіх мела спецыялізаваныя падсекцыі. Калі гістарычныя сюжэты былі падзелены па храналагічным прынцыпе (да 1945 г. і пасля 1945 г.), то праблемы культуры абмяркоўваліся зыходзячы з наступнага падзелу: «Этнаграфія: тэматыка ў апрацоўцы. Упрыгожванні, вопратка, канструкцыя», «Этнаграфія: сімволіка, уяўленні, рэгіянальная спецыфіка», «Самасвядомасць».

Падчас работы першай секцыі закраналіся пытанні існавання Гуцульскай рэспублікі ў 1918—1919 гг. і яе ролі ў фарміраванні ўкраінскай дзяржаўнасці, яўрэйска-лемкскіх адносін у гады Другой сусветнай вайны, становішча і статуса Падкарпацкай Русі ў 1918—1945 гг., высялення насельніцтва з Лемкаўшчыны ў 1944—1947 гг., пазіцыі праваслаўнай і ўніяцкай царквы ў пытанні перасялення. Шмат дакладаў датычыліся аналізу жыцця лемкаў ва ўмовах сацыялістычнай Польшчы і Югаславіі. Цікавым і вельмі кранальным было паведамленне Н. Кляшторнай аб пазіцыі нашчадкаў выселеных з Польшчы бойкаў і лемкаў на тэрыторыі акупаваных Данецкай і Луганскай абласцей Украіны на сучасным этапе.

Пры абмеркаванні пытанняў, звязаных з матэрыяльнай і духоўнай культурай, даследчыкі звярталі ўвагу на мастацка-фальклорныя традыцыі Лемкаўшчыны, Бойкаўшчыны і Гуцульшчыны, асаблівасці стварэння традыцыйнай народнай вопраткі і ўпрыгожванняў, арганізацыю і правядзенне вяселляў, хрысціянскіх свят і інш. Навукоўцы падкрэслівалі рэгіянальныя адметнасці і адначасова звярталі ўвагу на характэрныя для розных тэрыторый агульныя рысы ў культуры лемкаў, бойкаў, гуцулаў і русінаў.

Той факт, што ў канферэнцыі прымалі ўдзел даследчыкі з розных краін і розных нацыянальнасцей і этнасаў, абумовіў часам эмацыйны характар пасяджэнняў. Было відавочна, што нашчадкі выселеных у пасляваенныя гады народаў па сёння знаходзяцца пад уплывам траўматычнага досведу. Разам з тым дзякуючы мадэратарам эмоцыі падчас дыскусіі не зашкальвалі. Абмеркаванне нават цяжкіх пытанняў насіла пераважна аб’ектыўны, узважаны характар, што дазволіла даць навуковую ацэнку факту пасляваеннага высялення і перасялення ўкраінцаў, лемкаў, бойкаў, гуцулаў, русінаў. Матэрыялы дакладаў удзельнікаў канферэнцыі арганізатары мяркуюць выдаць да моманту правядзення наступнай сустрэчы, якая адбудзецца праз два гады ў г. Банска-Бістрыца (Славакія).

**Л. А. Козік**, дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян БДУ